2014 год.

Шматко, Я. Зэльва і Сапегі / Яніна Шматко // Праца. – 2014. 3 верасня. – С. 6-7.

Другі год запар Ганненскі кірмаш пачынаецца навукова-практычнай канферэнцыяй, якую арганізуюць райвыканкам і Гродзенскі філіял Каардынацыйнага бюро Праграмы падтрымкі Беларусі Федэратыўнай уладай Германіі. У мінулым годзе навукоўцы ўнеслі шэраг цікавых прапаноў па “раскрутцы” зэльвенскага брэнду, дарэчы, некаторыя з якіх сёлета былі рэалізаваны. З нецярпеннем гісторыкі і краязнаўцы чакалі кампетэнтнага слова знаўцаў гісторыі і ў гэтым годзе. Тым больш, што тэма канферэнцыі была цалкам прысвечана нашаму рэгіёну і мела назву – “Роля Сапегаў у жыцці Зэльвенскага краю”.

Адкрываючы сустрэчу, намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Юрый Кулікоў адзначыў, што тэма канферэнцыі даволі знакавая. Ведаць і правільна інтэрпрэтаваць сваю гісторыю сёння вельмі актуальна. Фігуры Сапегаў, Радзівілаў і іншых магнатаў Беларусі заўсёды прыцягвалі ўвагу вучоных. Але роля іх у гісторыі ацэньваецца часам вельмі палярна.

Сапегі – гаспадары зэльвенскіх маёнткаў.

Даклады загадчыка аддзела крыніцазнаўства і археалогіі Інстытута гісторыіі НАН Беларусі, кандыдата гістарычных навук Аляксандра Доўнара, дактаранта кафедры новай і навейшай гісторыі Беларусі гістарычнага факультэта БДУ Сяргея Токця і кандыдата гістарычных навук, дацэнта Іны Соркінай дазваляюць яскрава ўявіць ролю Сапегаў у развіцці Зэльвы і Дзярэчына ўвогуле, і іх асабістых маёнткаў у прыватнасці.

Як адзначыла Іна Соркіна, рост мястэчак якраз і спарадзіў сваім Статутам 1588 года яркі прадстаўнік сапегаўскага роду – Вялікі Канцлер Леў Сапега. У Сапегаў, як і ў іншых магнатаў, было шмат уладанняў. Расказваючы пра іх, дацэнт на медыяэкране ілюстравала выявы палацаў, інтэр‘ераў сядзіб. Зацікавілі прысутных план храмаў на плошчы Зэльвы, выявы сінагогі, Дзярэчынскага палаца. Навукоўца паведаміла шмат інтрыгуючых фактаў пра карцінныя галерэі, бібліятэкі і архівы ў палацах, дзівосныя сады і паркі, аранжарэі. Нагадала пра мануфактуры Сапегаў, у прыватнасці папяровую, што размяшчалася не так далёка ад Зэльвы – бліз возера Паперня. Аляксандр Доўнар падкрэсліў, што Сапегі вельмі адказна ставіліся да падбору кіраўнікоў сваіх фальваркаў. Выпадковых людзей там не было. Выконваючы розныя дзяржаўныя і грамадскія абавязкі, Прадстаўнікі славутага роду мелі магчымасць наймаць людзей, якія зарэкамендавалі сябе ў іншых магнатаў, не лічачыся з грашовымі выдаткамі. Сяргей Токць падрабязна расказаў пра зэльвенскі маёнтак Сапегаў у розныя гады яго існавання. Як сведчыць Інвентар 1616 года, ён размяшчаўся на поўначы сучаснай вуліцы Булака. Дзяліўся на дзве часткі, ахоўваўся

агароджай і вялікімі варотамі. На адной частцы двара стаяў крыты гонтай двухпавярховы дом, у якім размяшчалася вялікая зала для гасцей. Дом на другой частцы быў меншы і не такі прывабны. (Наступныя Інвентары паказваюць, што будынкі пастаянна абнаўляліся). Непадалёку стаялі гаспадарчыя прыбудовы. Мелася пяць агародаў, на якіх высаджвалі цыбулю, пастарнак, агуркі, рэпа і іншыя культуры. Амаль да касцёла "на горцы" цягнуліся сады, у якіх раслі нават цеплалюбівыя вішні. Улічваючы, што зіма 1630-31 гг. была вельмі марознай, можна зрабіць вывад, што недарэмна заплаціў Сапега свайму адміністратару добрыя грошы, калі той здолеў абараніць сад ад нязвыклага холаду. Для развя-дзення рыбы каля рэчкі было выкапана некалькі ставаў. З дамашніх жывёл гадавалі валоў, быкоў, цялят, кабаноў, гусей, курэй, коней. Коні ў Інвентары апісаны па масцях. Відаць, гэта таксама мела значэнне пры продажы ці вывядзенні новых парод. Сенажацей для коней хапала: яны былі побач, за рэчкай. На ворыўнай зямлі сеялі жыта, пшаніцу, ячмень, гарох, авёс. Аўсу адводзілася прыкладна 20 % усёй пашні, і гэта цалкам зразумела: корму для коней трэба было многа. (Інвентар 1631 г. улічвае 3 стайні з коньмі). Клапаціліся ў маёнтку пра запасы на доўгую зіму. У Інвентарах пералічваюцца кадкі з мёдам, агуркамі, рыбай... У сырніцах было шмат высушаных сыроў.

Цікава, што млынары абодвух млыноў абавязаны былі штогод выкармліваць па 7 кабаноў. Акрамя гэтага, яны клапаціліся і пра зёлкі ў садзе. Для патрэб гаспадаркі і сялян мелася кузня.

Працавалі ў маёнтку жыхары з вёсак Конна, Холстава, Красная і мяшчане з Зэльвы, для іх умовы наёмнай працы былі лягчэйшымі, чым для сялян. У самыя напружаныя дні сенакосу ці жніва выходзілі на працу ўсе ад мала да вяліка, пакідаючы ў хатах з малымі дзецьмі непрацаздольных членаў сям'і. А ў звычайныя дні кожная сям'я абавязана была адпрацаваць у фальварку тры дні з валокі (1 валока – прыкладна 20 га).

Па звестках Інвентара 1633 г. відаць, што гаспадарка мела неблагі прыбытак, бо з чаго б Сапегі абавязвалі сялян вазіць лішкі прадукцыі ажно ў Вільню!
Належная ўвага ўдзялялася пажарнай бяспецы. У кожным сялянскім двары меліся лесвіцы, бочкі з вадой, іншыя прылады для тушэння пажару. З кожных двух дамоў вылучаўся адзін чалавек для начной аховы.
З больш пазнейшых Інструкцый, выяўленых Аляксандрам Доўнарам, ён спыніўся на скла-дзенай у 1796 г. Францішкам Сапегам. Зіма 1795 года была надзвычай снежная, таму трэба было гэта ўлічваць у рабоце Дзярэчынскага порта. Францішка хвалявала пытанне аб транспарціроўцы жыта з Дзярэчына ў Каралявец (сучасны Калінінград). Порт, што звязваў Дзярэчын праз Шчару і Нёман з балтыйскімі гарадамі, патрабаваў пільнай увагі. У сваёй Інструкцыі гаспадар стараецца ўлічыць усё да дробязей. І колькі людзей павінна быць у двух камандах рачнога судна, і колькі бочак яно прыме, і як гэтыя бочкі выкарыстоўваць у непагадзь... Даведаліся і пра харчаванне малайцоў (матросаў) за кошт гаспадара.

Інструкцыі былі не сухімі загадамі: у іх ёсць шэраг цікавых звестак пра розныя здарэнні. Напрыклад, апісваецца выпадак, які сведчыць пра славу зэльвенскага кірмашу. У Пінску ў аднаго з мяшчан укралі каня. І той шляхціч некалькі гадоў запар спецыяльна прыязджаў у Зэльву, каб прасачыць, ці не для Ганненскага кірмашу быў конь украдзены.

Як дбайных гаспадароў, Сапегаў непакоіў прэстыж Ганнен-скага кірмашу. Каб захоўваўся належны парадак, людзі Сапегаў сачылі за падазронымі асобамі, не дапускаючы крадзяжу і разбою. Дзеля бяспекі купцоў і пакупнікоў месца продажу коней выдзялялася за мястэчкам.

Агаворвалася ў Інструкцыі і такая важная справа, як збор падаткаў. Ён даручаўся найбольш давераным служачым, якія сачылі, каб ніхто не прадаваў тавар танней за пана, каб не прапаноў-валі гарэлкі, запраўленай вішняй ці зёлкамі, бо гэты каньяк меў права рэалізоўваць толькі гаспадар кірмашу і г.д.

Выклікала ажыўленне ў зале і паведамленне пра рэфармаванне судовай практыкі і яго аргументацыя: Францішак Сапега ўлічваў… нянавісць сялян да паноў-прыгнятальнікаў. Як людзі разумныя, лічыў ён, сяляне здольны самі разабрацца са злачынцамі. Ён прапануе выбраць дзясятнікаў (прадстаўнікоў ад дзесяці двароў), і тыя разам з войтам будуць разглядаць справы. Магнат рэкамендуе не практыкаваць фізічных пакаранняў, а больш разлічваць на маральнае ўздзеянне. Напрыклад, віноўны не павінен мець права наведваць масавых мерапрыемстваў (той жа Ганненскі кірмаш) на нейкі пэўны час.
Гэта Інструкцыя, як лічыць Аляксандр Доўнар, – важны крок да гарадскога самакіравання. Магчыма, яно і было ў Зэльве, проста пацвярджаючых тое фактаў пакуль не выяўлена.

Знакавыя постаці роду.

Кандыдат філалагічных навук, дацэнт Генадзь Праневіч адзначаў, што дынастыя Сапегаў існавала ў гісторыі каля 600 гадоў! Такіх родаў няшмат ва ўсім свеце. І тым больш мы можам ганарыцца гэтым фактам, што 96% усіх уладанняў Сапегаў размяшчалася на землях сучаснай Беларусі! І толькі 4% – на іншых, але, заўважым, блізкіх да тэрыторыі Беларусі.

І пакінулі Сапегі за працяглы час свайго існавання многа добрай памяці ў гісторыі і культуры краю. У жыцці роду навукоўца выдзяляе 2 перыяды: ліцвінскі і рэч-паспалітаўскі, калі магнаты ўсё больш цягнуліся да польскай культуры і мовы. Для прадстаў-нікоў роду характэрна інтэграванасць у еўрапейскую культуру. Неацэнны ўклад як у беларускую, так і сусветную культуру ўнёс сваёй дзейнасцю Леў Сапега. Шмат зрабілі і яго нашчадкі. Дацэнт вылучыў літаратара і мецэната Фрыдэрыка Сапегу, палкаводца, ваяводу віленскага і вялікага гетмана літоўскага Паўла Сапегу, гетмана войска Дзмітрыя II Самазванца, Яна Пятра Сапегу, асветнікаў Ганну

Паўліну Ябланоўскую і Аляксандра Антоні Сапегу ды і шэраг іншых. (У вучонага даследаванне пра ўклад Сапегаў у культуру і гісторыю Беларусі займае не адзін дзясятак старонак).

Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі ГрДУ імя Янкі Купалы Сяргей Амелька пазнаёміў з генеалогіяй роду Сапегаў, назваў іх нашчадкаў, якія праявілі сябе ў палітыцы і культуры не толькі Беларусі, але і замежжа.

Прафесар кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін, доктар гістарычных навук Святлана Марозава падкрэсліла, што гісторыкі лічаць Льва Сапегу другой пасля Францыска Скарыны асобай у культуры Беларусі. Чалавек, які шмат гадоў займаў месца Канцлера ВКЛ, зрабіў для станаўлення беларускай нацыі столькі многа, што яго ролю цяжка пераацаніць.

У перыяд жыцця Льва Сапегі вельмі складанай ва ўсёй Еўропе, у тым ліку і ў ВКЛ, была рэлі-гійная сітуацыя. У Масковіі і Рыме існавалі вялікія прэтэнзіі на душы (і землі, вядома) жыхароў ВКЛ. У палітыкаў узнікла ідэя ўмацаваць дзяржаву праз рэлігію, не даць Маскве і Рыму разарваць ліцвінскую дзяржаву на часткі. Вялікае княства Літоўскае спрабуе займець сваё годнае месца сярод мацнейшых дзяржаў свету. Як дальнабачны палітык, Леў Сапега падтрымлівае новы накірунак у рэлігіі – уніяцтва, спадзеючыся на жыватворны ўплыў сінтэзу праваслаўя і каталіцызму на ўсё грамадскае і дзяржаўнае жыццё. Карыстаючыся аналізам пісем Льва Сапегі да Іпацыя Пацея, Крыштофа Радзівіла, Язафата Кунцэвіча, дакладчыца звярнула ўвагу, як тактоўна, але настойліва адстойвае свае погляды на складаную праблему Канцлер. Асаблівае значэнне надала пісьму Сапегі да Кунцэвіча ад 22 сакавіка 1621 года, бо з ім звязана мноства фальсіфікацый. Палітычнага дзеяча вельмі непакояць метады, якімі Кунцэвіч і яго паслядоўнікі пашыраюць уніяцтва. Леў Сапега не дапускаў і думкі аб праследаванні адной рэлігіі другой. Будучы права-слаўным у дзяцінстве (уплыў бацькоў), кальвіністам у юнацтве і сталым веку (уплыў Радзівілаў), а ў канцы жыцця каталікам, – Леў Сапега нейтральна ставіўся да ўсіх канфесій. Галоўнае, лічыў ён, каб чалавек верыў у Бога і паводзіў сябе згодна з запаве-дзямі. Сапраўднай талерантнасцю, падкрэсліла даследчыца, Вялікі Канцлер апярэдзіў сваю эпоху на сотні гадоў. І сёння мы з удзячнасцю згадваем гэтага мудрага палітыка і дыпламата, патрыёта беларускага народа.
Сваімі даследаваннямі пра Францішка Сапегу падзяліўся студэнт ГрДУ імя Янкі Купалы Валерый Бялы. (Дарэчы, і ў мінулым годзе ў канферэнцыі ўдзельнічалі маладыя даследчыкі даўні-ны з Гродзенскага ўніверсітэта. І гэта вельмі радуе!).

Студэнт-філолаг не мог не зацікавіцца Францішкам, бо менавіта яго лічаць героем рамана Эжэна Сю “Таямніцы Парыжа”. Каларытная фігура гэтага чалавека і сапраўды не пакідае раўнадушным нікога, хто знаёміцца з родам Сапегаў. У 21 год – генерал артылерыі; удзельнік паўстання Тадэвуша Касцюшкі; расійскі тайны саветнік; дэлегат ад шляхты на каранацыю Паўла

І ў Маскве; любоўнік фаварыткі Напалеона; карцёжнік і авантурыст – усё гэта пра аднаго і таго ж чалавека, уладальніка Зэльвы, Дзярэчына і шэрагу іншых мястэчак Францішка Сапегу.

Выяўленне кнігазбораў Сапегаў.

Уявіць жыццё любога магнацкага роду без бібліятэкі немагчыма.
Усебакова адукаваныя людзі, Сапегі, стагоддзямі збіралі лепшае з тагачаснай сусветнай літаратуры. Інтэнсіўнымі пошукамі раскіданага па свеце кніга-збору Сапегаў займаецца Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Аб гэтым паведаміў на канферэнцыі намеснік дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Аляксандр Суша.

Большасць кніжнага багацця Сапегаў знаходзіцца ў Літве, Польшчы, Расіі, Украіне. Кнігі вельмі дарагія. Набыць іх практычна немагчыма. Але ёсць шмат шляхоў для азнаямлення з імі. Перш за ўсё, вядома, трэба іх выявіць, падрабязна апісаць кожны асобнік і ўказаць месца яго захоўвання. Так папаўняецца электронны каталог. Ідзе пошук людзей, найперш выхадцаў з Беларусі, якія могуць садзейнічаць атрыманню копій, рэканструкцыі кніг. Праведзена вялікая работа па наладжванні кантактаў для арганізацыі выстаў, на якіх магчыма дамовіцца аб часовым вяртанні некаторых кніг для працы навукоўцаў. Бібліятэкары стараюцца трапіць на ўсе навуковыя сімпозіумы, семінары і г.д., дзе ідзе гаворка аб страчанай спадчыне. Вядуцца даследаванні, пашыраюцца веды пра найбольш цікавыя выданні. Адным словам, выкарыстоўваюцца ўсе магчымасці, каб нашы веды пра Сапегаўскае кніжнае багацце папаўняліся з кожным годам.

Аляксандр Суша на відэаэкране дэманстраваў выявы некаторых кніг з Сапегаўскага кніга-збору. Уражвае як іх прыгожае аздабленне, так і эрудыцыя прадстаўнікоў гэтай дынастыі, бо кнігі ў іх былі на ўсіх еўрапейскіх мовах і па ўсіх галінах ведаў.

Абмен думкамі.

Пытанні да вучоных былі розныя. Напрыклад, чаму годам атрымання Сапегамі прывілею на правядзенне Ганненскага кірмашу называюць то 1720, то 1721 год. Або “Калі лепш працавалі Інструкцыі?”, “Калі было больш самастойнасці?” і г.д. Раўнадушных у зале не аказалася. Навукоўцы або адказвалі на пытанні, або прасілі звязвацца з імі па інтэрнэце. Думаецца, што пасля гэтай плённай працы прыхільнікаў гісторыі ў нас стане намнога больш. І павагі да славутага роду Сапегаў, якія баранілі нацыянальную адметнасць беларусаў, спрыялі развіццю навукі, культуры і гаспадаркі, – таксама.

Крэчка, К. Ганненскі кірмаш – радасць цікавых сустрэч / Клаўдзія Крэчка // Праца. – 2014. – 6 верасня. – С.1-2.

Кожны год на Ганненскі кірмаш у Зэльву прыязджае шмат ганаровых гасцей. У 2014 годзе сярод іх былі… Аляксандр Вярсоцкі - першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама, Ала Сопікава – дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Сяргей Чыкун – намеснік старшыні Берастаўіцкага райвыканкама, Іван Варанец – намеснік старшыні Свіслацкага райвыканкама, Уладзімір Мазго – намеснік галоўнага рэдактара часопіса “Нёман”, Ганаровы грамадзянін Зэльвенскага раёна.

Миклашевич, И. Музыкальное ассорти / Ирина Миклашевич // Праца. – 2014. – 10 верасня. – С. 4.

В 2014 году, во время Анненской ярмарки жители и гости района смогли увидеть яркие выступления артистов: Романтичный и дерзкий Саша Немо.

С сольной программой в первый день Анненской ярмарки выступил белорусский певец Саша Немо. Артист исполнил все песни «вживую». На его концерте прозвучали новые и знакомые треки. Перед каждой песней певец рассказывал какую-нибудь историю – из своей жизни, о рождении той или иной композиции. Вообще, все песни Саши Немо – автобиографичны. Одни трогательно-печальные, другие – бесшабашно весёлые. Но каждая по-своему цепляет, будь то ритмичный танцевальный хит или лирическая баллада.

Звала в пляс балалайка.

На ярмарке задорно звучала и звала в пляс балалайка Александра Воронище (Александр играет на гитаре, домре, баяне, аккордеоне, скрипке, трубе, саксофоне и банджо, но ближе ему балалайка).
Зрители диву давались, как он виртуозно владел своим музыкальным инструментом, как пластично двигался на сцене, заряжая публику, что называется, с пол-оборота. Такой вот уникальный энерджайзер.

«Рада» принесла радость и, кстати, не только радость.

Пёстрые наряды, мелодии, от которых пробирает дрожь и играет кровь, душераздирающие романсы, искромётные танцы – приятные эмоции и веселье были обеспечены каждому.
Безудержной энергией, которая исходила от солистов, танцоров и музыкантов коллектива, казалось, был пропитан сам воздух.
На ярмарку музыкальный театр «Рада» (г.Гродно) приехал сразу с несколькими песенно-танцевальными программами: цыганской «ГИНЭ РОМА» и фольклорной «Казаки».

Хороши «Хорошки».

С танцевальной белорусской культурой знакомил леген дарный хореографический ансамбль «Хорошки». Зрители смогли увидеть и услышать звучание уникальных народных инструментов. Происходящее на сцене напоминало яркое буйство красок развесёлой белорусской ярмарки: пёстрые ленты, сарафаны девушек и, конечно, разноголосье рожков и чёткая дробь каблучков. Статные хлопцы и стройные девчата в национальных одеждах завораживали своими отточенными движениями.

Шоу от белорусской «дочери Востока».

Зельвенцам и гостям посёлка певица Гюнешь запомнилась, прежде всего, сильным вокалом и женственными нарядами. Восточная красавица с белорусскими корнями на Анненской ярмарке исполнила более десятка песен из своего репертуара. В Зельву певица приехала с танцевальным коллективом «Гарем-шоу». Помимо новых песен, грациозная Гюнешь исполнила свои знаменитые хиты – «Дочь Востока» и «Хабиби».

Харизматичный Слуцкий.

Отличное наст роение отдыхающим на ярмарке подарил молодой белорусский исполнитель поп-музыки Евгений Слуцкий. 23-летний харизматичный певец прекрасно держался на сцене, а в перерывах между песнями шутил со зрителями на разные местечковые темы.

Шумович, А. Архитектурные проекты от Нагорного / Алеся Нагорного // Праца. – 2014. – 17 верасня. – С. 4.

Прогуливаясь по многочисленным объектам Анненской ярмарки, жители городского посёлка не могли не заметить появившиеся незадолго до праздника малые архитектурные новшества – деревянные сооружения с висящими подковами и изображением лошади, чудо-деревья, указывающие, словно в сказке, путь, расписные ворота у некоторых подворий… За всем этим стоит неуёмная фантазия и выдумка главного архитектора района Владимира Нагорного. И вот, в канун ярмарки некоторые из задумок удалось воплотить в жизнь.

Неподалёку от СШ № 2 и уже известного зельвенцам резного колодца по улице Советской появились интересные сооружения с подковами. По словам Владимира Нагорного, это не что иное, как обереги Зельвы. Для города, славившегося некогда лошадьми, нельзя было придумать более подходящего талисмана.

Дабы не заплутать участникам Анненской ярмарки в гуще праздничных событий, в наиболее оживлённых местах были «посажены» деревья-указатели. Конечно, надписей вроде известных присказок-предупреждений «Направо пойдёшь – жену найдёшь, налево – коня потеряешь» на них не

было. Но маршрут они задавали верно, чем немало облегчили людям поиск нужной площадки.

Белоусова, Е. «Кірмашовы цуд»: традиции и современность / Евгения Белоусова // Праца. – 2014. – 24 верасня. – С. 4.

В конкурсе на лучший стилизованный костюм, который прошел во время Анненской ярмарки, приняли участие работники районного Дома ремёсел, сельских учреждений культуры, жители и гости посёлка. Организаторы и создатели нарядов сделали акцент на привлечении внимания к уникальным ценностям традиционного белорусского костюма, его этнической самобытности.
Вечером на летней эстраде все желающие смогли насладиться дизайнерским творчеством вживую. На конкурс были представлены оригинальные работы, каждая из которых заслуживает отдельного внимания.
Каждая из пяти показанных коллекций объединила в себе работы нескольких авторов: «Беларускі ўзор», «Спадчына», «Калекцыя касцюмаў XVIII стагоддзя», «Крэатыў» и «Непаўторнасць».

Победителями были признаны работники Кошелёвского Дома фольклора, которые представили коллекцию женских белорусских костюмов конца XIX – начала XX века – «Пятрэвіцкі строй». Второе место заняла дизайнер Елена Жидок, третье – досталось Елене Суша.
Одна из важнейших особенностей белорусского костюма – его приверженность традиции. Вбирая в себя многообразные веяния на протяжении столетий, он долгое время сохраняет свой неизменный крой. Но, несмотря на эту самую устойчивость так называемого «белорусского облика», мастера всегда находили и будут находить необычные варианты для его воплощения.

Матюк, Н. Креатив из «Працы» / Наталья Матюк // Праца. – 2014. – 24 верасня. – С.4.
Превратить газетные полосы в интересные и креативные наряды попытались участники конкурса, объявленного редакцией в преддверии Анненской ярмарки. Вооружившись необходимым материалом, ножницами и прочими канцелярскими принадлежностями, зельвенцы взялись за работу. Кто-то попробовал заглянуть в интернет, а кто-то решил смастерить модель самостоятельно, руководствуясь исключительно своей фантазией и обладая элементарными швейными навыками. Итак, посмотрим, что получилось.
Довольно необычно выглядел головной убор, представленный Инной Агей из отделения дневного пребывания для инвалидов. На цилиндре запечатлена целая история ярмарки с неотъемлемыми её атрибутами: мельница, лошадь, бричка, наполненная мешками с зерном.
Декорированием шляпы Инна Анатольевна занималась вместе с молодыми

инвалидами.
Заявили о себе Лилия Амельянчик, Ангелина Чечет, Елена Пайзулаева, Дарья Григорьева, самый юный участник Максим Ситько сделал шапку-трансформер. И название придумал юмористическое «Беларускі індзеец». С одной стороны такое своеобразное «изобретение» выглядит как корона, с другой – как головной убор индейца. Для украшения использованы разноцветные атласные ленты.

Все конкурсанты получили заслуженную оценку зрителей во время празднования Анненской ярмарки и подписку на газету «Праца» на IV квартал.

Попка, Л. Ганненскі кірмаш-2014: ёсць што сказаць / Людміла Попка // Праца. – 2014. – 27 верасня. – С.4.

Карэспандэнты «Працы» працягваюць цікавіцца меркаваннямі людзей наконт арганізацыі правядзення Ганненскага кірмашу.

Мацюк, Н. Калі прыгажосць становіцца стылем жыцця / Наталя Мацюк // Праца. – 2014. – 4 кастрычніка. – С.9.

Падчас сёлетняга Ганненскага кірмашу цэнтр Зэльвы змяніўся да непазнавальнасці.
Па традыцыі тут размясціліся пляцоўкі сельскагаспадарчых арганізацый і сельсаветаў, якія прымалі ўдзел у конкурсе “Кірмашовы падворак”.

З самай раніцы руплівыя гаспадары спяшаліся як мага лепш добраўпарадкаваць свае імправізаваныя сядзібы. Пры падвядзенні вынікаў конкурсу ўлічвалася многае: арыгінальнасць тэрыторыі двара, утульнасць у доме, выкарыстанне ў афармленні нацыянальных традыцый, кветкавы дызайн і інш.

Кожны ўдзельнік творча падышоў да пас таўленай задачы і праявіў сваю фантазію. Варта адзначыць, што на кожнай сельскагаспадарчай пляцоўцы дэманстраваліся народныя абрады: хрэсьбіны, заручыны, вяселле, уваходзіны ў новы дом, провады ў армію, выпечка караваяў і інш. Прычым суправаджалася ўсё гэта цікавым і пазнавальным аповедам.

Шумович, А. Город мастеров в Зельве / Алеся Шумович // Праца. – 2014. – 11 кастрычніка. – С.9.

И рук, и сердца щедрый дар.

Гродно, Слоним, Мосты, Новогрудок, Кореличи – народные мастера приехали из многих уголков области. Свои лучшие работы представляли также ремесленники и умельцы, впервые приехавшие на Гродненщину.

Деревянные ложки, расписные тарелки, тканые пояса, соломенные шляпы, корзины из лозы, глиняные кувшины и другие творения – подлинный триумф старинного ремесла!

В удивительном Городе мастеров остановиться хотелось у каждой палатки – потрогать и обязательно приобрести сувенир на память. Долго можно было любоваться изделиями из соломки и бисера. Здесь и венки, и панно, и деревца, и элегантные украшения...Глаза разбегались при виде кружев и вышивки, соломенных изделий и изящных керамических фигурок. Покупателя нашли и живописные картины, расписные деревянные кухонные досочки.

Буквально заворожил «монетный двор», где демонстрировал чеканку мастер из ассоциации монетных кузнецов Беларуси. Сувенир делали на глазах у заказчика, причем можно было выбрать из набора изображение, которое будет на аверсе и реверсе. Для изготовления предлагались три металла – медь, алюминий, латунь.

Хит продаж – славян ские куклы-обереги ручной работы. Самые распространенные персонажи – куклы-подружки, желанницы, -десятиручницы, пеленашки.

Неизменная любовь покупателей – ажурные скатерти и салфетки, вышитые рушники. Тут вам и декоративно оформленные подушки, и узорные салфетки, и тончайшей работы платки. Такими вещами люди просто восхищались, мол, надо же, какой техникой овладели мастера. Традиционно на ярмарке было много бижутерии. Как заводского производства, так и hand made, что называется. Приобретя такой подарок, зельвенские красавицы могли смело отправляться в кресло к одному из художников-портретистов, чтобы на бумаге запечатлеть свою красу. Многие так и делали. Некоторые же покупали готовые картины. Холсты с произведениями искусства заняли целую лужайку.

Каравай-каравай, кого хочешь выбирай!
Визитной карточкой Анненской ярмарки из года в год остается конкурс караваев. На нынешнем празднике хлебная тема вновь заняла главенствующее положение.

Столы с караваями разных форм и размеров, словно магнитом, притягивали прохожих. Ничего странного – чтобы удивить народ и жюри, хозяюшки простояли у плиты не один час. Зато каков результат! Украшенные различными плетениями, колосьями, фигурками из теста, караваи радовали глаз и заставляли, не лукавя, хвалить их мастериц.

В общем, на Анненской ярмарке можно было купить все, что душе угодно: от непритязательной свистульки и ароматного кекса до кованых мангалов и

пышных караваев. Те, кто хоть раз побывал на подобном празднике народных мастеров, обязательно возвращаются.